# БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й страп. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 9. Менск. Серада 3 красавіка 1918 г. Год I


## *Менск 3/IV.*

«Народ, выхаваны у пьянтві, рабстві, ніразумеючы некых лятуценняў інтэлігэнцыі... грамаднае, разлезлае цела, баўленае смаку да дзержаўнаго будавання, забіты да бязтуцця, пьяненькі, да агіды цярплівы, і па сваяму хітрэнькі. маскоўскі народ зяўсягды быў псіхалагічна чужы расейскай інтэлігэнцыі, каторая ашуківала сябе, веручы у нейкую «самабытнасць рускай культуры»... Гэтыя чумныя словы цяпер вырваліся у М. Горкаго (Новая Жызнь), каторы ідэалізаваў «басяка», знаходзіў у яго рыцарскі характар.

Прачытаў я кучу расейскіх газэт, галава і нэрвы ня могуць вытрымаць: нейкі крывавы пагромны туман. Рэжуць, бьюць, паляць, зьмялі с твару зямлі г. Каканд у Туркестане, толькі за тое, што сарты зрабілі на аснове замаздначэня праўлення. Мір і зняцце фронту развязалі рукі салдацкай пугачоўшчыне, каторая цяпер можа, ні сьпешаючы углубляць рэвалюцыю, грабіць і бурыць тое, што ішчэ уцалела. І гэта можэ цягнуцца доўга, покуль, альбо з былай імпэрыі ня зробіцца пустыня, альбо/ чужая сіла «кроўю і жалезам», прыверне у рабоў палітычных і эканамічных, «самы рэвалюцыйны, па думцы Леніна і Троцкаго, народ у сьвеце.

Гэта «рэвалюцыя», кажэць важак італіанскіх сацыалістаў Лабрыола, адкіне у зад і спыніць сацыялістычны рух рабочых усяго сьвету і рэакцыя падымець галаву.

* * *

У нас, у Беларусі, што цяпер робіцца па мястэчках і весках—мы ўсе добра ведаем. Парадак, спакой і зварот чужога добра праводзіцца жалезнай рукой, Але беларус, ціхі земляроб, гаспадар падлегае адразу парадку і пэўным законам. Спісак яго старых грахоў нівялікі: гэта разграбленые маёнткі і пасечаные лясы. Нігдзе ён ні паліў дамоў, маёнткаў, не рабаваў па дарозе.

Беларус маець сваю старую культуру, ён стварыў раней усіх суседзяў законы «Літоўскі статут, бо без закону жыць ні мог.

Цэнтральнае правіцельства ў Пецербургу прысылаець «бумагу», раздзяліць «увесь жывы і мертвы інвэнтар», у дварох «зараз жа». Тысячы свабодных «таварышэй» расейскіх, з розных камітэтаў: армейскіх, корпусных, дівізіонных гарнізоьных прыводзілі гэты закон у жыцце, пасылаліся «каміса-ры» у папахах углубляць рэвалюцыю і гдзе ішчэ ні падзялілі інвэнтар, «немедлено» раздяліць. Львіная палавіна пападала салдатам, многіе з іх павязлі «з вайны» тысячы рублеў у Расею. Вёска брала, бо усё роўна нехто возьміць. Вайна, фронт і рэвалюцыя дэмаралізавала грамадзянства ад верху да нізу. Больш саліднья селяне пратэставалі проціў пагромаў, але гэтые пратэсты ніклі прэд салдацкім штыком, і ботам.

І моцные інтэлыгэнтныя людзі трацілі галаву ці можна вымагаць многа ад прымітыўнай псіхікі і простаго розуму селяніна бэларуса.

* * *

«Араратор» са штыком казаў: «бяры, я штыком памагу». На першым селянскім зьездзе у Менску рэволюцыонны «паліцмэйстер» Міхайлаў (большэвік з земгусароў) мужыкам, каторыя ішчэ глядзелі на «рэвалюцыю», як гусь на молнію, прыказаў разьезжацца і дзяліць маёнткі і раздаў селянам «бумагі», прокламацыі. Віленскі першы рэволюцыонны «губэрнатор» з Дзісны, так сама разасла̂ў рэзалюцыі зьезда- дзе «усе была дано усім» з подпісью «прывесьці зараз жа к споўненню. Рознае «начальства» «зьезды» засыпалі беларусоў такімі прыказамі.

Селянам здэталося, што неба і земля перавярнулася, і усе фундамэнты жыцця збурыліся.

* * *

Окупацыйныя уласьці робяць парадак, ён патрэбны бо час ваенны. Але у нас і да вайны было так, што законы парушаліся, невыпоўняліся. Пры некатарым спрыце, альбо за «куку у руку», можна было закону невыпоўняць. Народ вырас у безпраўі. Цяпер народу прыходзіцца рабіць колькі скокаў: вярнуцца ад рэвалюцыі і вайны да нармальных парадкаў, але на Заходзе нармальны парадак, гэта выпоўненне тэч—у— тэч закону і прыказаў. Народ ні прывыкне адразу да гэтаго, ён не выгадавап на законе.

Магчымы колізі. Ізноў жа пасрэднікаў памеж заходне—эўропейцам і цёмным селянінам—інтэлігентаў—німа, бо ў нас на вёсцэ іх рапей ні было. Такіе пасрэднікі смягчылі бы многія вострыя вуглы. Ня глядзючы на гэта Беларусь цяпер самы спакойны край у былай Імпэрыі.

## Патрэба часу.

Беларускі кнігарняны рынак бедны кнігамі. Чаму гэта так пэўне ведаюць усе і аб гэтым німа чаго гаварыць.

Глаўным чынам, у нас ні было каму друкаваць, нават пасьля 1905 г. Пачаўшае наладжывацца як сьлед, наша наймацнейшаё і найлепшае выдавецтва—«Віленская выдавецкая суполка» пасьля заняцця нямецкім войскам Вільні-ні магла функцыанаваць як натрэбна. У Расіі-же вайна наагул зрабіла німагчымым якое нібудзь выдаўніцтва дзеля даражыні друку і паперы. Такім чынам, хаця і пісаліся працы але ні з'яуляліся у сьвет, а гэта запыніла і самоя пісанне, асабліва навукова і папулярна-навукавых кніг. Да таго мы ні мелі свае школы.

Зьмяненыя цяпер умовы вымагаюць ад нас найбольш усілкоў у гэтым кірунку. Трэба арганізаваць выдавецтвы, трэба пісаць кнігі. І кнігі глаўным чынам учобныя. Нідаўна паусталае у Менску выд. т-во »Заранка« паставіла сабе імення гэтакую мэту, але канечне трэба каб «Заранцы“ дапамаглі усе. Выдаць трэба начаць с кніжак для пачатковых школаў.

Лемантар, першая і другая чытанка выданы у Вільні. Трэба у другоя выдаць у найбольшай лічбе і пры гэтым звёрнуць асаблівую увагу на людовыя песьні (вясельныя, радзінныя і др.] і казкі, так каб гэтыя падручнікі па тыпу падходзілі да «Радного Слова» ф. I і II Ушынскаго. Друкаваць, іх трэба як, і іншыя кнігі для пачатковае школы абоймі шрыфтамі — гражданскім і лацінскім. Затым трэба падрукаваць найлепш граматыку нашаго маладого вучопаго *Тарашкевіча.* Граматыка павінна мець пры сабе цьвічэння.

Задачнік Юрэвіча ні кепскі, але ён ні адпавядае павучным і пэдагогічным заданням, што тычыцца выкладання чатырох спраў.

Усе чатыры справы павінны разглядацца, як развіццё адпае справы: складання. Значыцца трэба пісаць альбо новую арытметыку з дадаткамі у гэтум сэнсі, альбо дадаць мэтодыку для вучыцялеў, як карыстацца задачнікам у тым самум напрамку.

На гісторыі можна надрукаваць гісторыю Уласта, аднак у тым духу, каб відаць было больш жыцце беларускаго народу, як князеў яго.

Трэба выдаць географію у якой зьвернена навінна быць увага асабліва на эканамічныя і гандлевыя стасункі краю у параўнаню з другімі краямі. Затым патрэбна кніжка па естествазнаўству, у якой павінны быць апісаны найпростыя экспэрыменты па фізіцы, хіміі, біолёгіі, якія можна зрабіць у кожнуй селянскуй хаці з хатнімі статкамі.

Трэба ужо цяпер думаць аб выдаванню кніжак для сярэдняй школы, што так сама павінна пачацца як найхутчэй.

Для усяе гэтай вялікай працы мы пэўны у нас знайдзецца досыць інтылігэнтных сілаў. Патрэбна толькі арганізацыя. Нам здаецца, што нівялічкі з,езд беларускіх пэдагогаў, шмат памог-бы справе. На ім удалося-б высьветліць што ёсьць гатоваго да друку, што ішчэ трэба напісаць, устанавіць мэтод выкладаў па беларуску, падзяліць тэмы і інш.

А. Д.

## Менскі Вучыцельскі Інстытут.

Вучыцельскі інстытут атчыняны быў у Менску 1-го ліпня 1914 г. С прычын ваеннаго часу інстытут гэты ў кастрычніку [сенцябры] 1915 г. перавялі ў Яраслаўль; туды ж пыраехалі тады і ўсе вучні інстытуту і дзеля гэтата навука у інстытуці, ні зважаючы на эвакуацыю,ніспынялася.

У цяперашнім часе навука ідзе уваўсіх трох класах. Апрача гэтаго ў мінулым року пры інстытуці істнавалі аднарочные пэдагагічные курсы для падгатоўкі вучыцялёў для выжэйшых пачатковых школаў. На гэтых курсах летась было 80 чалавек. Такіе ж курсы вядуцца і сёлята, хоць запісаўшыхся па іх цяпер менш.

Дзякуючы акуратнасьці і эканомнаму расходу грошай, якія выдаваліся на утрыманне інстытуту, а так сама дзякуючы падмогам ад Менскай Месцовай Земскай Управы [3000 р.] і ад міністэрства народнай прасьветы, інстытут—за чатыры рокі свайго істнавання патрапіў на свае ашчаднасьці закупіць дамовую абстанову, нажыць добрую бібліатэку і наладзіць для патрэб інстытуту фізычны і хімічны габінэты.

На моцы пастановы Часоваго Ураду 14 ліпня 1917 р. вучыцельскіе інстытуты рэформаваны, праграма навуковая шмат павялічана і яны прызнаны Міністэрствам Народнай Прасьветы [цыркуляр за № 5566-м 1917 р.] вучэбнымі школамі стаячымі *выжэй сярэдніх.*

Дырэктарам інстытуту ад пачатку яго істнавання назначаны быў вядомы пэдагог сярод вучыцялёў нашаго краю—Дымітры Сьяпура. Як толькі былі ўведзяны выбары на дырэктароў у сярэдніх вучылішчах, пэдагагічная карпарацыя інстытуту—у адзін голас выбрала таго самога Д. Сьяпуру, як незамячімаго вучыцеля пэдагогікі і філёсофіі і самага практычнаго адміністратара і кіраўніка ўсяго жыцця інстыту-

## Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 2 красавіка 1918 року.

ЗАХАД:

Палажэнне на фронці ні зьмянілося. Контратакі ніпрыяцеля каля Эбютэрн, асабліва упартыя у забраных намі высотах паміж Авр й рэчкаю Люсь адбіты с цяжкімі для ворага стратамі.

Паміж Авр і Оазаю нівялічікя пяхотныя баі.

Французы ні пакідаюць абстрэліваць Лаон. Ад абстрэлівання пацярпело шмат жыхароу.

У разьведачных баех на усходнім берэзі Мааса каля Одзімон і у пауднева—усходні бок ад Тани забрано шматъ палонных.

Учора зьбіто 22 ніпрыяцельскія лятучыя машыны і 5 прычэпных баленау.

Лейтэнант Кроль здабыу сваю 23 паветраную перамогу.

Пры энэргічнымъ правядзенню нагляду на участку ад марского берегу да поудня—усходу ад Соммы 2-м упаветры—плаваючым адзяленнем падъ вадзіцельствам старшаго лейтэнанта Фрынке зроблены выразные усьпехі.

На другіх фронтах нічога новаго.

Першы генэрал кватэрмэйстар

**фон-Людэндорф.**

---

ту. І цяпер уся вучыцяльская корпарацыя разам с сваім дырэктарам жыве як адна дружная сьмяя, аддаючы ўсе сваі сілы вялікай сьвятой справе.

У Яраслаўлю інстытут прабыў ужо тры рокі; далей заставацца яму там німа ніякай патрэбы, бо гэтае места мае свой вучыцельскі інстытут; гэткім парадкам менскаму інстытуту хутка прыходзіцца зрабіць якую колячы пастанову: або варочацца у свой родны край—у Менск, або пярэбірацца ў якое другое расійскае места, кудо яго, разумеецца, вельмі ахвотна прымуць. а нат ужо цяпер стараюцца пярэцягнуць.

Д. Сцяпура зьвертаўся да нікаторых грамадзкіх арганізацый у справе звароту вучыцельскаго інстытуту у Менск, але нідзе нічога ні дабіўся.

Чым жэ заняты галавы нашых цяперашніх заправіл і хто яны такіе, калі такая справа, як вучыцельскі інстытут на Беларусі—так мала іх цікавіць?

Трэба спадзевацца, што знойдзецца *такая беларуская арганізацыя*, каторая не прасьпіць так важнай справы для сябе і не аткладаючы, займецца шчыра каб Менскі Вучыцельскі Інстытут вярнуць у Менск.

Немцы на навуку, на прасьвету глядзяць вельмі паважна і пэўна што ў гэтэй справе ад іх можня спадзевацца не пярашкоды, а помачы і прыхільнасьці.

---

## Аб уезьдзе у Маскву.

Маскаўская рада Р. С. і С. дэпутатоў пастанавіла, што за 50 : 100 вёрстаў ад Москвы, на каждай ж. д. павінны быць створэны пункты для рэвізыі едучых у Маскву. Без дазволу «савецкай уласьці» ніхто ні будзя пропушчан праз гэтыя пункты. Па усіх ж. д. атданы прыказ выдаваць білеты толькі да гэтых станцыяў; прадажу білетаў далей і у Маскву рабіць толькі з дазволу ўлады. Білетаў для праезду праз Маскву у другія гарады ні выдаваць, а кіраваць пасажыруакольнай дарогаю, абмінаючы Маскву. Безбілетніх штрафаваць 10 кратнай вартасьцю білета і адсылаць назад. Маючых білеты, але ні маючых дазволу ехаць у Маскву адсылаць назад. Начальнікі станцыяў нарушаючые пастанову будуць увольніваюца ад службы.

**Перавод «савецкаго» ураду у Маскву.**

У звязку с пераездам савецкаго ураду у Маскве была зроблена рэквізыцыя патрэбных для уселякіх установаў дамоў. Рэквізыцыя рабіліся асобнай камісіяй. Усе дамы (асабнікі) дзяліліся на тры катэгорыі: 1) дамы яшчэ рапей перданыя ўласьнікамі у агульна—ацыянальнае менне: гэта категорыя ні рэквізавалася 2) дамы меньшай артыстычнай вартасьці,—рэквізаваліся часьцёва; 3] дамы без артыстычнай вартасьці, але з каштоўнылі рэчамі у сяродку,—рэквізаваліся пасьля вывазу рэчай. Усім ўласнікам артыстычна важных дамоў, каторыя заяўлялі аб гэтым камісія выдавала пасьвядчэння, што дамы іх ні надлегаюць рэквізыцыі. Покуль што аставаліся без намешканняў Выжшая Рада народнай гаспадаркі і камісарыят працы.

**Пэнсіі у «савецніх» установах у Маскве.**

У звязку с паведамленнем Рады районых рад Масквы, зробленае камісарыяту працы, пэніі месцовых служачых у Маскве абніжэны. Сторож мае атрымоўваць 264 р., малодш. канторшч. і пісар 312 р. машыністка 1 разряду 360 р. шчотавод 408 р. памоцнік бухгалтэра і дзелавод 504 р., дзелавод і сэкрэт. 1 разр. 600 р., загадчык аддзелу II разр. 600 р. і I разр. 750 р.

Настаўнікам гарадскіх школаў,—пэнсія 432 р. на месяц.

---

## АТКАЗ.

— Паніч, да наганы ты трохі заскоры,—
Сказаў панічу наш стары—
Народ наш, што праўда, ён вышау с пакоры
І шчыра скажу: без пары!
Вядомые чэрці яго бунтавалі—
Ня тые ж усе мэскалі?
Якое там шчасьце сабе збудавалі,
Такое і нам тут далі:
Рабункі, разбоі, пажогу, крадзежу,—
Злічыць усято ні бярусь,—
Усякое ліха... У тую ж адзежу
Адзелі яны Беларусь!
Ня добра, панічык, вядома пягожа,
Зрабіў нікаторы ў той час!
Дык помста за гэта нічым ніпоможа,—
Крыху зразумець трэба і нас.
Ці ж можна нат вінаваціць сьляпога,
Калі ён упёрся у плот?
Ня знойдзіш у жыці зерняці другога,
Як выб'еш увесь акалот!..
Ці добра, ці кепска, а вы векавалі,
У цемні трымаючы нас...
Якую капейку вы у сьвет выдавалі—
Такая вярнулась да вас...
Дзяды і ўнукі на вас працовалі,
Каб вы у навукі ішлі...
Над чым жа магзі вы свае мацавалі,
Якую карысць нам далі?
Ад веку—прадвеку зямлю мы аралі
Сваей самадзельнай сахой
І людзі чужые нам плуг паказалі,
Прывёзшы здалёку с сабой
Ня чулі ад вас мы сэрдэчнаго слова,
Бо вы жартавалі усьцяж,
Сьмяшыла вас наша адзежка і мова,
І звычай дзядоўскі той наш.
З усходу мы відзелі толькі нагайкі,
Прыказы, наказы і кнут,
А вы тут, як дзецям, нам баялі байкі...
З заходу казалі: ганцгут!..
Усім нам прыходзе пара навучыцца,
Як людзі па сьвеце жывуць,
І трэба цярпеннем крыху заручыцца—
Цярпенне навукай завуць...
Ніхай жа засьвеце ласкавая слонцэ,
Усіх абагрэе зараз,
Ніхай зазірне, усьміхнецца ў ваконцэ
Да нас, панічок, і да вас...

30/III 1918 р.
Менск.

**Захар Вехац.**

---

## МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

**Духоуная кансысторыя**, як мы ужо пісалі, жывіцца пакуль што ні на сынадальныя срэдствы, а на тутэйшыя—эпархіальныя. Такіх срэдстваў можа хапіць ні больш, як на месяцы тры.

Спіскі а выплаце пэнсый парафіяльнаму духавенству пішуцца і падаюцца акуратна у казначэйство, але гэта нічога, разумеецца, ніпамагае. Хіба што нямецкае начальство зьверне на гэта увагу і справу гэту так, чысяк наладзіць.

---

**Бруноука вуліц**, не зважаючы на цяжкае палажэнне селятняе з грашыма, усе ж ткі будзе ісьці у Менску; будзе работа—будуць заработкі, і гэта дзякуючы энэргіі і стараннем вядомага тутэйшаго дзеяча грамадзянскаго—інж. Цывінскаго. Ці ня дойдзе урэшці чарод на такіе забытые куты, як Людамант (дзе ішчэ і хаднікоу німа!), Камароука, Вяселая в. (каля шпіталю), Маркаускі зав., Конны пляц і інш.?

---

**Нарада каталіцкаго і праваслаунаго духавенства** у справі Івянецкаго і менскаго жаночаго манастыроу, якая назначана была у кватэры тутэйшаго ксендза-дзекана Сьвятополк-Мірскаго—не адбывалася бо праваслауные духоунікі ні прышлі на нараду.

Перэдача жаночаго манастыру каталіком гэткім парадкам ня выяснена; івянецкі манастыр ужо перэдадзены каталіцкаму духавенству і туды выехау 29 г. м., назначены пробошчам, ксэндз Кухарскі, быушы кальварыйскі, а пасьля вязынскі пробошч.

---

**«У чырвоным крыжу заходняго фронту»** замест даунейшых 200—, цяпер асталося толькі 41 служачых; 159 чалавекъ разлічылі саусім, заплатлі па дзень службы, апрача ліквідацыйных, пэнсіі і па 40 рублеу кожнаму на дарогу—у Расію. Застаушыеся на службі атрымалі за сакавік, апрыч пайку, пэнсіі покуль што па сто рубл. На апецы гэтых служащихъ тры шпіталі у Менску і 4-ы у Гомялі, дзе за апошніе часы хворых найбольш немцау.

---

**Беларускі Камітэт помочи афярам вайны** зьбяднеу цяпер саусім. З 280 тысячау рублеу, якія чуць выціснуу камітэт ад бальшевікоу (а патрэбау $1^1/_2$ міл.) ішчэ перад калядами ні асталося нічога. На апецы камітэту было 180000; дзяцей—60000; пайкоу выдано 24000 на 170000 рубл.; школ—сталовых у Менску—4, карміушых 1162 душы; прытулак для дзяцей на Петраградскай—на 11 дз. прытулак для старыхъ—на 70 душ. Школы: у Койданові, Мар'іной - Горцы, Пухавічах, Ігумяне і Лебядзеві. І гэта пералік толькі з большаго. А трэба ведаць, колькі намучыуся камітэт, покуль ен «уладзіу» справу с Земсаюзам і Сагорам, адкуль трэба было пярэняць маетнасьць для божанскіх арганізацай.

Цяпер запрапасьціліся нейдзе ішче 20000 р., за каторымі у сваім часе паехалі у франтовыя арганізацыі і да гэтуль аб ніх ні слуху, ні духу.

І дарма цяпер нешчасные бежанцы абіваюць пароги камітэту: ен нічога памагчы ім ні можа.

---

**Вышеyу II № «Вольнае Беларусі»** замест яго такі: Устауная Грамата, «Вольная Беларусь», «Рашучы акт» стацця М. К.; «Што значыць пан, што мужык, а што хам», ст. Н. Чарноцкаго, «Залеты» камэдыя у 3 дзеях Наума прыгаворкі (В. Дунін-Марцінкевіча), Вершы і др.

---

**Чароднае пасядзэнне Рады Беларускай Народнай Рэспублікі** замест 1-га назначано на 7-ое красавіка.

---

**Упрауленцам Л.-Р. ж. д. выдана на дарогу** чацьвертая часьць належачих па штату грашау. Гэта падмога на дарогу у Маскву—у канцэлярыю службы зборау (эвакуіров. у 1915 г.), дзе быць можа удасца атрымаць усе астаткі з бальшэвіцкімі наддаткамі, пачынаючы з восені мінулаго году. Што і казаць: кавалак пахучы, але далека вісіць...

---

**У міліцыі** новы нямецкі ваенны паліцмэйстар хутка маніца завесьці новые парадкі. Перш на перш пойдзе чыстка ад усіх тых, кяторые так, ці іначэй нюхаліся з бальшэвікамі; прыймацца будуць служачые нат «старых парадкау» абы імя іх ні было чым запэпкана у мінулай службе усеважнейшыя справы міліцыі залежаць будуць ад нямецкаго паліцмэйстра (Койданоуская 28); так сама пад яго загад наступае і пажарная каманда; у кожны вучастак міліцыі ужо назначаны па два рускіх афіцэра, умеючых гаварыць па нямецку.

Гарадское самаупрауленне пастановіло проціу гэтых новых парадкау пратэставаць перад выжэйшым нямецкім начальствам у Коуні.

---

Сягодня, 3 го красавіка (апрэля) ад 6—8 гадзін вечара па эуропейскаму часу, у памешкані Беларускае Рады, Захароуская, 43, 3-і паверх, настаунік гімназіі п. С. Ленкоускі прачытае І-ую лекцыю свайго курсу: «Гісторыя права на Беларусі у звязку з яе культураю і панствовасцю».

---

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.